ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік галоўнага ўпраўлення
па адукацыі
Магілёўскага аблвыканкама
_____________ А.Б.Заблоцкі
"8" лістапада 2022 г.

**ЗАДАННІ**
**для правядзення рэспубліканскай алімпіяды**
**па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура"**

**КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА**

Дата правядзення: 20 лістапада 2022 г.
Час выканання заданняў: 10.00 – 13.00.

**XI клас**

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1.** У "Слоўніку лінгвістычных тэрмінаў" чытаем: "Пры складападзеле ўлічваецца закон узрастання гучнасці (самыя гучныя – галосныя гукі, за імі ідуць [й] і [ў], затым санорныя; найменшую гучнасць маюць шумныя зычныя, асабліва глухія), г. зн. замыкаюць склады галосныя, а таксама санорныя, калі за імі ідуць шумныя. Зычныя [й] і [ў] замыкаюць склады ў любым выпадку пры спалучэнні зычных".

Выкарыстоўваючы гэту інфармацыю, падзяліце на склады прозвішчы літаратараў, якія мелі званне народнага паэта ці пісьменніка Беларусі. Пры падзеле на склады выкарыстоўвайце вертыкальную лінію |.

УВАГА: прозвішчы дваіх літаратараў, якія не мелі звання народнага паэта ці пісьменніка, дзяліць на склады не трэба!

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| | | |
|---|---|---|
| Навуменка | Атраховіч | Міцкевіч |
| Панчанка | Багдановіч | Чыгрынаў |
| Лынькоў | Барадулін | Ліпскі |
| Броўка | Скурко | Макаёнак |

**Заданне 2.** У беларускім алфавіце 32 літары. Падбярыце назоўнікі і прыслоўі, якія заканчваюцца 10-ай, 22-ой, 28-ай, 29-ай, 30-ай і 31-ай літарамі алфавіта.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| № літары ў алфавіце | Словы, якія заканчваюцца на ўказаную літару | |
|---|---|---|
| | назоўнік (у пачатковай форме) | прыслоўе |
| **узор**: 1 | цана | доўга |
| 10 | | |
| 22 | | |
| 28 | | |
| 29 | | |
| 30 | | |
| 31 | | |

**Заданне 3.** Біблейская гісторыя стала крыніцай шматлікіх устойлівых выразаў, якія шырока выкарыстоўваюцца ў розных мовах свету. Падайце беларускамоўныя варыянты гэтых выразаў, замяняючы, дзе трэба, малую літару вялікай.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| Фразеалагізм на рускай мове | Фразеалагізм на беларускай мове |
|---|---|
| *вавилонское столпотворение* | |
| *валтасаров пир* | |
| *запеть лазаря* | |
| *земля обетованная* | |
| *иудин поцелуй* | |
| *фома неверный* | |

**Заданне 4.** Адгадайце слова, ведаючы яго лексічнае значэнне і адну з марфем, якая ўваходзіць у яго склад.

Заўвага: усе словы маюць у слоўніку памету "размоўнае".

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| Слова | Лексічнае значэнне | Адна з марфем |
|---|---|---|
| | 'безуважнасць, раўнадушша' | прыстаўка, як у слове *абы-што* |
| | 'агульная назва паўзуноў з доўгім, гнуткім целам без ног, змяя' | канчатак, як у слове *малпа* |
| | 'забрудзіць, вымазаць' | суфіксы, як у слове *даслаць* |
| | 'зайздрасць' | корань, як у слове *завідушчы* |
| | 'забрацца ў зацішнае, глухое месца; не паспець зрабіць што-небудзь' | постфікс, як у слове *забрацца* |
| | 'у ляжачым становішчы' | суфікс, як у слове *старчма* |

**Заданне 5.** Канчаткі дзеясловаў цяперашняга і будучага простага часу, як правіла, пачынаюцца з галоснага гука. Размяркуйце прапанаваныя дзеясловы ў табліцы ў залежнасці ад канчаткаў ва ўказаных формах: *выцерці, залежаць, запрасіць, качацца, падабраць, хацець.*

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| Першы гук канчатка | Дзеясловы цяперашняга ці будучага простага часу | |
|---|---|---|
| | форма 3-яй асобы адзіночнага ліку | форма 2-ой асобы множнага ліку |
| [а] | | |
| [і] | | |
| [о] | | |
| [ы] | | |
| [э] | | |

**Заданне 6.** Дапоўніце фармулёўкі правіл тэарэтычнымі звесткамі або прыкладамі.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

1. Лічэбнікі паводле значэння падзяляюцца на колькасныя (абазначаюць цэлыя лікі, зборныя, ________________) і __________________.

Лічэбнікі *два (дзве), тры, чатыры* ў назоўным склоне разам з прыметнікам дапасуюцца да назоўніка ў форме ________________ ліку ________________ склону: *тры* ________________ ________________.

Лічэбнікі ад пяці і вышэй у назоўным склоне ________________ родным склонам назоўніка ў ________________ ліку.

2. Дзеясловы ______________ (*бегчы, ісці* і інш.), волевыяўлення (*адправіць,* ______________ і інш.) пры абазначэнні ________________ дзеяння ўжываюцца з назоўнікам у форме вінавальнага склону з прыназоўнікам ***па***: *адправіць па* ________________.

**Заданне 7.** Перад вамі фрагмент кнігі, 60-годдзе выдання якой адзначаецца сёлета. Гэта кніга прынесла славу свайму стваральніку і стала класікай беларускай літаратуры. Пазнаёмцеся з фрагментам твора і вызначце справядлівасць сцвярджэнняў у табліцы.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

*(1) Большую частку года востраў быў як бы адасоблены ад іншых вёсак і мястэчак. (2) Нават у непаганыя дні рэдкія газеты ці лісты ад сыноў і братоў дабіраліся сюды ў паляшуцкай торбе нялёгка – каму было прыемна лазіць па гразі без вельмі важнай прычыны, – але і гэтая нямоцная сувязь са светам пры кожным зацяжным дажджы лёгка рвалася. (3) Восенню ці вясной яна перарывалася на*

*цэлыя месяцы: багна, што страшна разбухала ад слоты і разводдзя, адразала востраў ад свету мацней, чым гэта маглі б зрабіць абшары вадзянога прастору. (4) Многія дні людзі жылі, як на плыце, які злая нягода адарвала ад берага і занесла ў мора, – трэба чакаць адно, калі спадарожны вецер ці лёс зноў падгоніць да зямлі.*

*(5) Але такое становішча тут не палохала, людзям на востраве яно здавалася зусім звычайным. (6) З усіх бакоў, блізка і далёка, ведалі яны, – такія ж самыя выспы сярод бясконцых багнаў, дзікіх зараснікаў, што разлегліся на сотні вёрст з поўначы на поўдзень і з захаду на ўсход. (7) Людзям тут трэба было жыць, і яны жылі. (8) Аднастайныя, нудныя дажджы, што месяцамі лілі на мокрыя стрэхі, сцюдзёныя вятры, што люта білі ў замерзлыя вочкі-шыбы завеямі, цёплае сонца, што ўставала ў пагодныя дні над купамі алешніку, – усё бачыла гэты востраў заклапочаным, у няспыннай, штодзённай руплівасці. (9) Людзі заўсёды чым-небудзь былі заняты: уранку і ўвечары, летам і зімою, у хаце, на двары, у полі, на балоце, у лесе...*

| № | Сцвярджэнне | так | не |
|---|---|---|---|
| узор | Аўтар гэтага тэксту Уладзімір Караткевіч. | | + |
| 1 | Твор, з якога ўзяты гэты фрагмент, уваходзіць у “Палескую хроніку”. | | |
| 2 | У сказе №2 выкарыстана пабочная канструкцыя. | | |
| 3 | Паміж граматычнымі часткамі сказа №5 выніковыя сэнсавыя адносіны. | | |
| 4 | У сказе №5 ёсць састаўны іменны выказнік. | | |
| 5 | У сказе №4 ёсць даданая дапаўняльная частка. | | |
| 6 | У сказе №7 выкарыстана антытэза. | | |
| 7 | Першая граматычная частка сказа №6 няпоўная. | | |
| 8 | Сказ №8 ускладнены аднароднымі дзейнікамі. | | |
| 9 | Сродак сувязі граматычных частак сказа №6 – злучнік. | | |
| 10 | У сказе №5 ёсць недапасаванае азначэнне. | | |
| 11 | У фрагменце 3 складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак. | | |
| 12 | Сказ №9 ускладнены адасобленымі акалічнасцямі. | | |

**Заданне 8.** Вызначце правільныя сцвярджэнні, іх нумары абвядзіце кружком.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

1. Рамантызм – мастацкі напрамак, які сфарміраваўся на мяжы XVIII–XIX стагоддзяў у краінах Заходняй Еўропы. Цэнтр мастацкай сістэмы рамантызму – асоба, галоўны канфлікт – паміж асобай і грамадствам. У літаратуры Беларусі рамантызм праявіўся ў творчасці Яна Баршчэўскага, Уладзіслава Сыракомлі і інш.
2. Сімвал – ужыванне слова ў супрацьлеглым значэнні.
3. Асананс – паўтарэнне аднолькавых галосных гукаў у вершаваным радку.

4. Наступныя радкі Аляксея Пысіна напісаны чатырохстопным ямбам з пірыхіем:
*Хто бачыў, як дубы цвітуць*
*На ранняй зорцы сарамліва?*
*Затое ўсе чаромху гнуць:*
*Такую замець заварыла!*
5. Камічнае – жанр драматургіі, у якім смешна паказваюцца розныя (часцей адмоўныя) з'явы.
6. Сюжэт – сістэма ўзаемазвязаных падзей, паступовае разгортванне якіх раскрывае характары персанажаў і ўвесь змест эпічнага, ліра-эпічнага або драматычнага (драматургічнага) твора.

**Заданне 9.** Прачытайце ўрывак з сачынення няўважлівага вучня. Знайдзіце фактычныя памылкі, запішыце іх у табліцы, там жа ўкажыце правільны варыянт.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

*Апісаныя ў дэтэктыўна-прыгодніцкім рамане "Дзікае паляванне караля Стаха" падзеі адбываюцца ў 80-х гадах XVII стагоддзя ў маёнтку Балотныя Яліны і вакол яго. Альбо, як яшчэ называе аўтар гэты куток, – у "мядзведжай глушы".*

*Аповед вядзецца ад імя галоўнага героя Андрэя Беларуцкага – інтэлігентнага, мужнага, адукаванага, кемлівага і рашучага чалавека, занепакоенага лёсам свайго краю. Трапляе герой у Балотныя Яліны як фалькларыст, але застаецца як дэтэктыў. Найперш – каб разгадаць загадку дзікага палявання, якое не толькі прагне помсты старажытнаму роду Яноўскіх, але і нішчыць, рабуе людзей па вёсках. А яшчэ, вядома, каб падтрымаць Надзею, якая вар'яцее ў халодным каменным замку ад прывідаў, ад падоранага ёй старажытнага партрэта, ад тупату, які чуецца ў галасніках – і праз гэта паміpае ад нервовай гарачкі.*

*Супрацьстаяць жа Андрэю і дзяўчыне збяднелы шляхціц Рыгор – далёкі сваяк ейнага бацькі, а таксама яго прыбліжаныя Варона, "сабакар" Гарабурда і інш. Завалодаць палацам Яноўскіх было вырашана не толькі каб задаволіць шляхецкі гонар, але найперш каб даць навакольным паселішчам доўгачаканы мір і спакой.*

| Памылка | Правільна |
|---|---|
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |

**Заданне 10.** Уважліва паглядзіце на вокладкі прапанаваных кніг. Падумайце, што аб'ядноўвае гэтыя творы. Прыдумайце сюжэт уласнай кнігі, які б адпавядаў прапанаванай Вамі канцэпцыі аб'яднання твораў і закранаў важную праблему сучаснага грамадства.

Напішыце невялікі тэкст для сацыяльнай сеткі пра тое, што аб'ядноўвае ўсе гэтыя творы (уключаючы Ваш). У самым пачатку тэксту трэба звярнуцца да чытача–Вашага аднагодкі.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*










**Сюжэт уласнай кнігі**

Тэкст для сацыяльнай сеткі

# II ЭТАП XXXIX РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

## КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

### *ДАВЕДКА ДЛЯ ЖУРЫ*

**11 клас**

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | 6 | 6 | 6 | 6 | 6 | 6 | 6 | 6 | 6 | 6 | 60 |

**Заданне 1.**

| | | |
|---|---|---|
| На\|ву\|мен\|ка | А\|гра\|хо\|віч | Мі\|цке\|віч |
| Пан\|чан\|ка | ~~Багдановіч~~ | Чы\|гры\|наў |
| Лынь\|коў | Ба\|ра\|ду\|лін | ~~Ліпскі~~ |
| Броў\|ка | Скур\|ко | Ма\|ка\|ё\|нак |

*За кожнае правільна падзеленае па складах слова – 0,5 б. За вызначэнне асоб, якія не маюць звання народнага паэта ці пісьменніка (Багдановіч, Ліпскі), па 0,5 б.*

**Заданне 2.**

| № літары ў алфавіце | Словы, якія заканчваюцца на ўказаную літару | |
|---|---|---|
| | назоўнік (у пачатковай форме) | прыслоўе |
| 10 | *яслі* | *дзесьці* |
| 22 | *рукаў* | *далоў* |
| 28 | *канікулы* | *па-дзіцячы* |
| 29 | *медзь* | *воддаль* |
| 30 | *турнэ* | *яшчэ* |
| 31 | *меню* | *уволю* |

*За кожны правільны адказ – 0,5 бала. Прапанаваныя вучнямі адказы могуць адрозніваецца ад пададзеных тут.*

**Заданне 3.**

| Фразеалагізм на беларускай мове |
|---|
| *вавілонскае стоўпатварэнне* |
| *валтасараў баль* |
| *запець (заспяваць) Лазара* |
| *абяцаная зямля* |
| *юдаў (іудаў) пацалунак* |
| *Фама няверны (няверуючы)* |

*За кожны правільны адказ – 1 бал*

**Заданне 4.**

| Слова | Лексічнае значэнне | Адна з марфем |
|---|---|---|
| *абыякавасць* | 'безуважнасць, раўнадушша' | прыстаўка, як у слове *абы-што* |
| *вужака* | 'агульная назва паўзуноў з доўгім, гнуткім целам без ног, змяя' | канчатак, як у слове *малпа* |
| *выпацкаць, запэцкаць* | 'забрудзіць, вымазаць' | суфіксы, як у слове *даслаць* |
| *завідкі* | 'зайздрасць' | корань, як у слове *завідушчы* |
| *зашыцца* | 'забрацца ў зацішнае, глухое месца; не паспець зрабіць што-небудзь' | постфікс, як у слове *забрацца* |
| *лежма* | 'у ляжачым становішчы' | суфікс, як у слове *старчма* |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 5.**

| Першы гук канчатка | Дзеясловы цяперашняга ці будучага простага часу | |
|---|---|---|
| | форма 3-яй асобы адзіночнага ліку | форма 2-ой асобы множнага ліку |
| [а] | *выцерці, хацець* | *выцерці, падабраць, хацець* |
| [і] | *запрасіць* | *запрасіць* |
| [о] | | |
| [ы] | *залежаць* | *залежаць* |
| [э] | *качацца, падабраць* | *качацца* |

*За кожны правільны адказ – 0,5 бала.*

**Заданне 6.**

1. Лічэбнікі паводле значэння падзяляюцца на колькасныя (абазначаюць цэлыя лікі, зборныя, **дробавыя**) і **парадкавыя**.

Лічэбнікі *два (дзве), тры, чатыры* ў назоўным склоне разам з прыметнікам дапасуюцца да назоўніка ў форме **множнага** ліку **назоўнага** склону: *тры* ***высокія дрэвы***.

Лічэбнікі ад пяці і вышэй у назоўным склоне **кіруюць** родным склонам назоўніка ў **множным** ліку.

2. Дзеясловы **руху** (*бегчы, ісці* і інш.), волевыяўлення (*адправіць,* ***паслаць*** і інш.) пры абазначэнні **мэты** дзеяння ўжываюцца з назоўнікам у форме вінавальнага склону з прыназоўнікам *па*: *адправіць па* ***крэйду***.

*За кожны правільны адказ – 0,5 бала. Прапанаваныя вучнямі прыклады (выдзелены курсівам) могуць адрозніваццa ад пададзеных тут.*

**Заданне 7.**

| № | Сцвярджэнне | так | не |
|---|---|---|---|
| 1 | Твор, з якога ўзяты гэты фрагмент, уваходзіць у "Палескую хроніку". | + | |
| 2 | У сказе №2 выкарыстана пабочная канструкцыя. | | + |
| 3 | Паміж граматычнымі часткамі сказа №5 выніковыя сэнсавыя адносіны. | | + |
| 4 | У сказе №5 ёсць састаўны іменны выказнік. | + | |
| 5 | У сказе №4 ёсць дададзеная дапаўняльная частка. | + | |
| 6 | У сказе №7 выкарыстана антытэза. | | + |
| 7 | Першая граматычная частка сказа №6 няпоўная. | + | |
| 8 | Сказ №8 ускладнены аднароднымі дзейнікамі. | + | |
| 9 | Сродак сувязі граматычных частак сказа №6 – злучнік. | | + |
| 10 | У сказе №5 ёсць недапасаванае азначэнне. | + | |
| 11 | У фрагменце 3 складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак. | | + |
| 12 | Сказ №9 ускладнены адасобленымі акалічнасцямі. | | + |

*За кожны правільны адказ – 0,5 бала.*

**Заданне 8.**

Праўдзівыя сцвярджэнні: 1, 3, 4, 6.

Няпраўдзівыя сцвярджэнні: 2, 5.

*За кожнае правільнае вызначэнне праўдзівасці / няпраўдзівасці прапанаванага сцвярджэння – 1 бал.*

**Заданне 9.**

| Памылка | Правільна |
|---|---|
| раман "Дзікае паляванне караля Стаха" | аповесць "Дзікае паляванне караля Стаха" |
| XVII стагоддзя | XIX стагоддзя |
| Андрэя Беларуцкага | Андрэя Беларэцкага |
| памірае ад нервовай гарачкі | з'язджае разам з каханым |
| Рыгор | Дубатоўк |
| даць навакольным насельнікам доўгачаканы мір і спакой | трымаць ваколіцы ў страху і паслушэнстве *(магчымы іншыя варыянты, блізкія па сэнсе)* |

*За кожную правільна вызначаную памылку і правільнае выпраўленне налічваецца па 0,5 бала.*

**Заданне 10.** Ацэнку гэтага задання неабходна праводзіць сумарна па двух параметрах: сюжэт уласнай кнігі, тэкст для сацыяльнай сеткі. Агульны сумарны бал – 6.

Ацэнка сюжэта:

| *Колькасць балаў* | *Крытэрый* |
|---|---|
| 3 | *Сюжэт кнігі вызначаецца арыгінальнасцю (не паўтарае ўжо вядомыя сюжэты), унутранай лагічнасцю. Сюжэт закранае важную сацыяльную праблему.* |
| 2 | *Сюжэт кнігі вызначаецца арыгінальнасцю (не паўтарае ўжо вядомыя сюжэты). Сюжэт закранае важную сацыяльную праблему. Маюцца адхіленні ў логіцы пабудовы сюжэту.* |
| 1 | *Сюжэт кнігі вызначаецца арыгінальнасцю (не паўтарае ўжо вядомыя сюжэты). Маюцца адхіленні ў логіцы пабудовы сюжэту. Сацыяльная праблема ў сюжэце не вызначана або мае малазначны характар.*<br>*АБО*<br>*Сюжэт кнігі мае кампіляцыйны характар з некалькіх ужо вядомых твораў, але вызначаецца ўнутранай лагічнасцю. Сюжэт закранае важную сацыяльную праблему.* |
| 0 | *Сюжэт кнігі поўнасцю паўтарае ўжо вядомы твор (нават калі зменена месца дзеяння і асобныя персанажы).*<br>*АБО*<br>*Сюжэт кнігі мае кампіляцыйны характар з некалькіх ужо вядомых твораў, не вызначаецца ўнутранай лагічнасцю.*<br>*АБО*<br>*Адказ адсутнічае* |

Ацэнка тэксту:

| *Колькасць балаў* | *Крытэрый* |
|---|---|
| 3 | *Тэкст мае лагічнае абгрунтаванне аб'яднання чатырох кніг, адрасную скіраванасць (звернуты да аднагодкаў, мова зразумелая аднагодкам). Тэкст лагічны і кампазіцыйна завершаны.* |
| 2 | *Тэкст мае лагічнае абгрунтаванне аб'яднання чатырох кніг, адрасную скіраванасць (звернуты да аднагодкаў, мова зразумелая аднагодкам). Маюцца асобныя парушэнні логікі выказвання, кампазіцыйнай пабудовы, асобныя памылкі ў змесце.* |
| 1 | *Тэкст мае лагічнае абгрунтаванне аб'яднання чатырох кніг. Тэкст не мае адраснасці (звернуты не да аднагодкаў або не мае ўвогуле адзнак звароту). Могуць быць асобныя парушэнні логікі выказвання, кампазіцыйнай пабудовы, асобныя памылкі ў змесце.* |
| 0 | *Тэкст не мае лагічнага абгрунтавання аб'яднання чатырох кніг, нават калі маецца адрасны зварот да аднагодкаў, а тэкст лагічны і кампазіцыйна завершаны.*<br>*АБО*<br>*Адказ адсутнічае* |

***Заўвага да ўсёй работы:** за кожную арфаграфічную, граматычную, пунктуацыйную і інш. памылку здымаецца па 0,1 бала ў заданнях, ацэненых станоўчым балам.*